ном итоге позволят Республике Беларусь занять достойное место в мировом культурном пространстве.

*This article analyzes the development of the modern art of Belarus. Particular attention is paid to the development of new trends, current problems and achievements of modern Belarusian masters in fine art over the last two decades.*

***Дорожкин Андрей Сергеевич,*** аспирант Республиканского института высшей школы, г. Минск.

УДК 745

**Л. У. Дамнянкова**

## ВЫТОКІ АРНАМЕНТАЛЬНАЙ ПАБУДОВЫ СЛУЦКІХ ПАЯСОЎ

*Рассматриваются особенности композиционной структуры восточных поясов (персидских, индийских и армянских), характер орнаментального решения. Определяются общие и отличительные черты в художественном решении слуцких поясов.*

У вобразным рашэнні шляхецкага строю значную ролю адыгрываў «кунтушовы» пояс, які традыцыйна насілі з жупанам і кунтушам. Першапачаткова гэта былі высокаякасныя шаўковыя або ваўняныя тканіны, якія паступалі з Персіі, Турцыі, Індыі, Кітая. Попыт на такія вырабы ў Рэчы Паспалітай быў звязаны з асаблівасцямі шляхецкага касцюма, у якім пояс з'яўляўся неаддымнай часткай саслоўнага іміджу. Дэкаратыўнасць, узорыстасць, бляск шаўковых і залотных нітак садзейнічалі шырокаму распаўсюджванню не толькі саміх паясоў, але і стымулявалі арганізацыю ўласнай мануфактурнай вытворчасці.

Сама назва такіх майстарань па вырабу паясоў — «персіярня» невыпадкова. Вядома, што ў XVI–XVII стст. самымі папулярнымі ў Рэчы Паспалітай былі персідскія паясы, якія ткаліся ў Іспахане, Тэбрызе і Кашане. Гэтыя тэкстыльныя вырабы вызначаліся значнымі памерамі (4–5 м даўжынёй і шырынёй ад 30 да 70 см), разнастайнасцю арнаментальнага дэкору і яго тонкай прапрацоўкай, удалай кампазіцыйнай схемай, гарманічнасцю колеравых спалучэнняў і, безумоўна, высокай якасцю.

Калекцыя ўсходніх паясоў Нацыянальнага музея ў Кракаве [1, с. 62–190] дае магчымасць вызначыць іх спецыфічныя рысы і ацаніць ступень уздзеяння на фарміраванне кампазіцыйнай і арнаментальнай пабудовы слуцкага пояса.

У персідскіх (менавіта кашанскіх) паясах вылучаюцца дзве адметныя часткі: завяршэнні («галовы») і асноўнае поле («сярэднік»), арнаменталь-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нае запаўненне якіх адрозніваецца матывамі, іх пластычнымі рашэннямі і маштабнымі суадносінамі, спалучэннямі ў арнаментальныя структуры.

Кампазіцыйна канцы пояса будуюцца ў межах выцягнутага па гарызанталі прамавугольніка з пэўнымі суадносінамі бакоў (1:2,8; 1:3; 1:3,5). Унутры яго размяшчаюцца 4, але часцей 5 або 7 буйных арнаментальных матываў. Звычайна матыў уключаў у сябе мноства разнастайных элементаў: стылізаваных кветак, лістоў, бутонаў. Сілуэтная форма такога арнаментальнага ўтварэння варыятыўна і ўяўляе сабой прамавугольнік з закругленымі вугламі, авал, кроплю, пялёстак.

Найбольш пашыраны варыянт размяшчэння элементаў матыва па канцах пояса – па лініі вертыкальнай восі сіметрыі, якая акцэнтавалася буйной стылізаванай кветкай, або некалькімі, якія знаходзіліся адна над другой. Дастаткова прыкладаў асіметрычнага рашэння матыва, калі яго элементы кампанаваліся ў пэўным руху, што характэрна для выявы квітнеючага дрэва, галінкі, часам з уключэннем выяў птушак, людзей. У вызначаных варыянтах яскрава прасочваецца аднабаковая накіраванасць матыва знізу ўверх, якая падкрэсліваецца стылізаванай выявай глебы, ствала ці сцябла з галінкамі і г. д. Пашыраны і складаныя матывы з двума восямі сіметрыі, вертыкальнай і гарызантальнай.

Кракаўская калекцыя змяшчае і паясы, кампазіцыя канцоў якіх мае выразную сеткавую структуру з модулем ў выглядзе кветкавай «сляззінкі» [1, с. 76–77].

Цэнтральная частка персідскіх паясоў таксама адрознівалася варыятыўнасцю арганізацыі матываў, якія ўтваралі бардзюрную або сеткавую структуру. Як правіла, арнаментальныя бардзюры ўяўлялі сабой неншырокія шлякі, якія размяшчаліся гарызантальна (адносна кароткага боку). Колькасць рапортных паўтораў матыва ў бардзюры задавалася аналагічна канцам пояса, г. з. пяці ці сямі буйным матывам адпавядала такая ж колькасць паўтораў у гарызантальных шляках.

У адным вырабе дэкор цэнтральнай (і самай значнай па плошчы) часткі мог складацца з некалькіх бардзюраў (двух або трох), абавязкова ўзорыстых. Пры гэтым чаргавалася паласа даволі буйных матываў з паласой з дробных элементаў або больш разрэджаных.

Распаўсюджанне атрымала і сеткавая арганізацыя матываў, складзеная з пальмет, кропляў, кветак, раскіданых па ўсяму полю цэнтральнай часткі пояса. Менавіта пры такім запаўненні даволі часта сустракаецца дзяленне «сярэдніка» ўздоўж на тры роўных часткі двума ўзорыстымі бардзюрамі.

«Галовы» заўсёды абмяжоўваліся зверху і знізу бардзюрамі раслiннага характару. Па падоўжных баках пояса таксама ткаліся бардзюры, якія часцей за ўсё адрозніваліся па сваіх рашэннях і матывах ад бардзюраў «галоў». Іх шырыня прыблізна была аднолькавай, а вось арнаментальнае



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

запаўненне надзвычайна варыятыўна і па відах элементаў (раслінных, кветкавых, геаметрычных), і па пластычнаму і графічнаму вырашэнню.

У кампазіцыйным ладзе пояса пэўную роль выконвалі вузкія стужкі (ад 3–4 мм да 1 см), запоўненыя простымі геаметрычнымі фігурамі, якія ўзмацнялі падзел пояса на часткі, падкрэслівалі іх рытмічную арганізацыю і маштабныя суадносіны.

Ацэньваючы мастацкае рашэнне персідскіх паясоў, можна адзначыць багацце кампазіцыйных схем, структур, матываў, дакладнасць прапрацоўкі пластычных і рытмічных рухаў, супадпарадкаванасць арнаментальных тэм, што надавала высокае эмацыянальнае гучанне ўсёй кампазіцыі.

У Рэчы Паспалітай былі вядомы таксама і шаўковыя паясы з Індыі. Нешматлікія захаваныя ўзоры даюць уяўленне аб разнастайнасці мастацкага рашэння гэтага віду вырабаў. Сустракаюцца паясы, у якіх сярэдняя частка аднатонная, а канцы запоўнены буйнымі кроплепадобнымі медальёнамі з дробных раслінных матываў. У вырабах з багатай арнаментацыяй назіраецца своеасаблівая арганізацыя «сярэдніка», калі больш шырокія палосы ткаліся люстэркава адносна больш вузкіх, што стварала адчуванне сеткаватай структуры. Разгляд індыйскіх вырабаў сведчыць аб большай разнастайнасці кампазіцыйных схем, значнай варыятыўнасці запаўнення поля вырабаў дэкорам, часта перавагі гладкафарбаваных частак. Між тым, акцэнтаванне канцоў пояса стылізаванымі раслінными матывамі ўспрымаецца як агульная тэндэнцыя і ў індыйскіх паясах. Адзін з прыкладаў з калекцыі кракаўскага музея па сваёй арганізацыі вельмі падобны на турэцкія (армянскія) паясы. Гэта можна ўстанавіць пры параўнанні памераў (даўжыня 320 см, шырыня 30 см), структурных частак («галовы» і «сярэдніка»), па наяўнасці трох буйных матываў на канцах пояса, па запаўненню гарызантальных і бакавых бардзюраў раслінным дэкорам [1, с. 92–94]. Ранняе датаванне прыведзенага пояса пачаткам XVIII ст. дазваляе меркаваць аб перапрацоўцы кампазіцыйнай схемы персідскіх паясоў, аб памяншэнні іх памераў, што, верагодна, і было ўспрынята армянскімі рамеснікамі.

У еўрапейскіх краінах, асабліва ў Рэчы Паспалітай, атрымалі большае распаўсюджванне паясы, якія рабіліся армянскімі майстрамі спецыяльна на экспарт. Іх ткалі ў такіх буйных тэкстыльных цэнтрах Турцыі, як Стамбул і Бруса. Паясы рабілі двухбаковымі, меншымі па памерах (у даўжыню каля 3 м, шырыню – 30 см), багата арнаментаванымі і двухбаковымі. Таксама як у персідскіх, у іх захоўваўся падзел на «канцы» і «сярэднік», якія абмяжоўваліся арнаментальнымі падоўжнымі і папярочнымі бардзюрамі, шырокімі ў спалучэнні з вельмі вузкімі. На канцах пояса звычайна размяшчаліся тры буйных матыва расліннага характару, кампазіцыйная пабудова якіх вар'іравалася нязначна. Звычайна гэта была квітнеючая расліна, у якой добра прачытвалася яе сцябло. Яно ж з'яўлялася вер-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тыкальнай воссю сіметрыі. Пад пэўным вуглом ад яго адыходзілі бакавыя галінкі з разнастайнымі кветкамі. Матыў мог уключаць большую ці меншую колькасць элементаў, а яго сілуэтная форма набліжалася да прамавугольніка або авала.

Варыятыўнасць рашэння цэнтральнай часткі армянскіх паясоў таксама невялікая. У асноўным раслінныя матывы, якія ўключалі кветкі і зубчастыя лісты, чаргаваліся з гладкімі або нескладанай раслінна-геаметрычнай арнаментыкай і больш вузкімі палосамі. Асаблівасці арыентацыі зубчастых лістоў у шырокіх бардзюрах і іх люстэркавыя паўторы адносна вузкіх стваралі дастакова бачную ромбічную сетку.

У цэлым прапрацоўка арнаментальных матываў армянскіх паясоў не адрознівалася складанай дэталізацыяй і разнастайнасцю, у іх відавочна большая абагульненасць і спрошчанасць форм у параўнанні з персідскімі.

Кампазіцыйная пабудова слуцкіх паясоў на першы погляд падобна да рашэння турэцкіх вырабаў і гэта натуральна, паколькі менавіта армянін Ян Маджарскі (Аванес Маджаранц) перанёс традыцыю ўсходніх паясоў на беларускія землі [2, 3]. Творчы падыход да распрацоўкі кампазіцыі слуцкага пояса дазволіў майстру выпрацаваць арыгінальны стылістычны код, у якім арганічна спалучыліся дэкаратыўныя стылі Усходу і Захаду. Тонкая прапрацоўка арнаментальных матываў, іх разнастайнасць, прыёмы арганізацыі бардзюраў, падкрэсліванне падзелу на часткі зближаюць слуцкія поясы з лепшымі персідскімі ўзорамі.

Высокія мастацкія якасці слуцкіх поясоў, вынаходніцтва новага тыпу пояса (чатырохбаковага), значная варыятыўнасць у напаўненні дэкорам яго частак, гарманічнасць каларыту зрабілі вырабы слуцкай персіярні эталонам для шматлікіх мануфактур не толькі Рэчы Паспалітай, але і Расіі, Францыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Спіс літаратуры*

1. Taszycka, Maria. Pasy kontuszowe. Pasy wschodnie. Katalogi zbiorowe Muzeum Narodowego w Krakowie / Maria Taszycka. – Kraków, 1990. – 190 с.

2. Якуніна, Л. І. Слуцкія паясы / Л. І. Якуніна. – Мінск: Выд-ва Акадэміі навук Беларусі, 1960. – 240 с.

3. Лазука, Б. А. Слуцкія паясы: адраджэнне традыцый / Б. А. Лазука. – Мінск: Беларусь, 2013. – 127 с.

*Discusses the characteristics of the composite structure of the eastern sashes (Persian, Indian and Armenian), the nature of the ornamental solutions. Identifies common and distinctive features in the design of the Slutsk belts.*

***Дамнянкова Людміла Уладзіміраўна,*** кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, БДУКМ, г. Мінск